МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

05.04.2010 № 06-12/155

На № 5/м от 23.02.2010

(для Управы Маладзёжнага
грамадскага аб'яднання
"Малады Фронт")

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
грамадскага аб'яднання

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны матэрыялы адносна дзяржаўнай рэгістрацыі Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Малады Фронт» (далей – МГА «Малады Фронт»). Пры іх вывучэнні было ўстаноўлена наступнае.

Згодна заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі МГА «Малады Фронт» ад 23 лютага 2010 г., рашэнне аб стварэнні МГА «Малады Фронт» прынята на Устаноўчым З'ездзе, які адбыўся 30 студзеня 2010 г. у г. Мінску.

Парадак дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання і пералік дакументаў, неабходных для прадстаўлення рэгіструючаму органу, утрымліваецца ў артыкуле 13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", у адпаведнасці з часткай шостай якога для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў абавязковым парадку прадстаўляецца дакумент, які пацвярджае наяўнасць юрыдычнага адрасу грамадскага аб'яднання (месца знаходжання кіруючага органа).

Вывучэнне прадстаўленных дакументаў аб наяўнасці юрыдычнага адрасу ў МГА «Малады Фронт», указаннага ў падпункце 1.3 пункта 1 Статута МГА «Малады Фронт», паказала, што юрыдычным адрасам (месцам знаходжання кіруючага органа) МГА «Малады Фронт» з'яўляецца кватэра (жылое памяшканне) у шматкватэрным жылым доме па адрасу:

У адпаведнасці з артыкулам 8 Жыллёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь жылыя памяшканні прызначаюцца для пражывання грамадзян, што сведчыць аб устанаўленні для іх спецыяльнага прававога рэжыму мэтавага выкарыстання. Выкарыстанне не па прызначэнню прыгодных для пражывання жылых памяшканняў не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, МГА «Малады Фронт» не прадставіла ў Міністэрства юстыцыі пацвярджэння наяўнасці юрыдычнага адрасу, якое б адпавядала патрабаванням заканадаўства, што згодна з абзацам чацвёртым артыкула 15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" з'яўляецца падставай для прыняцця рашэння аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

Згодна са звесткамі, якія маюцца ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь, 43 заснавальніка МГА «Малады Фронт» (больш паловы ад іх агульнай колькасці), у тым ліку амаль усе члены кіруючага органа дадзенага грамадскага аб'яднання, прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, многія з іх неаднаразова, у тым ліку за правапарушэнні, звязаныя з парушэннем грамадскага парадка, правоў і свабод другіх асобаў (старшыня МГА «Малады Фронт» Дашкевіч Дз.В. 16 разоў, Жукоўскі К.І. – 23 разы, Шыла І.У. – 17 разоў, Кутасаў Д.В., Самойлава К.С. – 13 разоў, Мацвееў Р.А., Карноў Дз.Э. – 11 разоў і г.д.).

Вышэйазначанае не сведчыць аб намеры заснавальнікаў МГА «Малады Фронт» ажыццяўляць дзейнасць у межах заканадаўства Рэспублікі Беларусь, не парушаючы грамадскі парадак, правы і законныя інтарэсы другіх грамадзян.

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 14 і абзацам чацвёртым часткі трэцяй артыкула 15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", рашэннем калегіі Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 1 красавіка 2010 г. у дзяржаўнай рэгістрацыі МГА «Малады Фронт» адмоўлена.

Дадзенае рашэнне можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу месяца з моманту яго атрымання.

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў — А.Л. Сліжэўскі

Вык. Какуша 200 62 47
02.04.2010. паведамленне аб адмове ў дзярж.рэг. МГА «Малады Фронт»